**УДК 726.7 (476)**

# Роля сучаснага праваслаўнага манастырскага комплекса ў структуры паселішчаў і міжсялібных тэрыторый Беларусі (1990-2009 гг.)

**Арабей В.Г.,** асістэнт кафедры «Жылыя і грамадскія будынкі», БНТУ

**Анатацыя**

*У артыкуле робіцца кароткі гістарычны агляд развіцця манастыроў Беларусі. Выяўлены тыпы сучасных манастырскіх комплексаў, дана класіфікацыя варыянтаў размяшчэння іх на тэрыторыі краіны. Праводзіцца аналіз горадабудаўнічых рашэнняў сучасных манастыроў праваслаўнага веравызнання і іх роля ў прасторавай структуры паселішчаў і міжсялібных тэрыторый. Разглядаюцца варыянты размяшчэння манастырскіх комплексаў у структуры горада: (цэнтральная частка, перыферыйная частка, рэкрэацыйныя тэрыторыі); у структуры сельскіх паселішчаў (у цэнтры паселішча, унутры забудовы, на ўскраіне паселішча); на міжсялібных тэрыторыях. Прыводзіцца класіфікацыя манастыроў паводле паходжання (аднаўленне, новае будаўніцтва, прыстасаванне). На падставе праведзенага аналізу даюцца рэкамендацыі па гарманічнай інтэграцыі манастырскіх комплексаў у структуру паселішчаў і раскрыццю іх горадабудаўнічага патэнцыялу.*

**Уводзіны**

Спрадвеку праваслаўныя манастыры з'яўляліся цэнтрамі духоўнасці, культуры, адукацыі Беларусі. Яны ўяўляюць сабой комплекс царкоўных, жылых і гаспадарчых будынкаў, абнесеных сцяной і прызначаных для пражывання, набажэнстваў і працы іх насельнікаў [1, с. 82]. Самаадданае служэнне манахаў дае ўзоры высокіх подзвігаў і дасягненяў на ніве духоўнага ўдасканалення і развіцця мастацтваў, навук. Значны ўплыў на фарміраванне структуры гарадоў і міжсялібных тэрыторый аказвалі манастырскія ансамблі, з'яўляючыся важным элементам архітэктурнай кампазіцыі паселішча.

Першыя праваслаўныя манастыры з'явіліся на Беларусі ў X-XII стст.: у Полацку — Барыса-Глебскі і яшчэ 2 манастыры; у Тураве — Варварынскі і Барыса-Глебскі з епіскапскімі рэзідэнцыямі. У XIII-XVI стст. было заснавана 40 праваслаўных манастыроў, большасць з якіх былі дробнымі. Недалёка ад Навагрудка ў 1225 годзе вялебным Елісеем быў закладзены Лаўрышэўскі Прасвятой Багародзіцы мужчынскі манастыр, які з цягам часу стаў лаўрай [2, с. 5]. У выніку стварэння уніяцкай царквы (1596 г.) і падтрымкі яе дзяржавай значная частка праваслаўных манастыроў была перададзена ёй. Пасля скасавання уніі ў 1839 г. адбыўся адваротны працэс. Падзеі кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 г. сталі прычынай масавага закрыцця манастыроў, і толькі ў перыяд 1941-1959 гг. назіралася часовая адліга рэлігійнага жыцця. У 1960-х надыйшла наступная хваля атэістычнай барацьбы, ў выніку якой былі зачынены ўсе праваслаўныя манастыры Беларусі акрамя Свята-Успенскага мужчынскага манастыра ў Жыровічах [3, с.194].

Духоўнае адраджэнне і аднаўленне манаскага жыцця, якое павольна пачалося ў канцы 1980-х гадоў, у перыяд 1990-х - 2000-х разгарнулася буйнымі маштабамі рэстаўрацыі, рэканструкцыі і новага будаўніцтва. На сённяшні дзень у Беларусі дзейнічае больш за 30 праваслаўных манастыроў, частка якіх месціцца на старадаўніх манастырскіх землях, частка – створаныя на новых. Па-рознаму яны ўваходзяць у прасторавую структуру паселішчаў і міжсялібных тэрыторый, але аб'ядноўваючым з'ўляецца працэс будаўніцтва, уласцівы ўсім новастводаным манастырам. Зважаючы на

існуючую сітуацыю актыўнага развіцця манастырскага будаўніцтва, актуальным з'яўляецца аналіз сучаснага горадабудаўнічага досведу ўзвядзення манастыроў. Атрыманыя высновы дапамогуць прымаць аптымальныя рашэнні пры далейшым праектаванні і будаўніцтве манастырскіх комплексаў.

**Асноўная частка**

З пункту гледжання горадабудаўніцтва характэрнай рысай манастырскага комплексу з'яўляецца даволі вялікая ізаляванасць яго жыццядзейнасці ад навакольнага свету, пэўная самадастатковасць. З аднаго боку, манастырскае жыццё патрабуе сканцэнтраванасці на ўнутраным духоўным жыцці, максімальнага аддалення ад свецкіх турбот. З другога боку, менавіта манастыры выступаюць як асноўныя захавальнікі духоўных каштоўнасцяў, якімі заўсёды служылі грамадству. Гэты чыннік ў сваю чаргу прыцягвае вялікую колькасць вернікаў, якія наведваюць манастыры з мэтай духоўнага акармлення. Названыя умовы паўплывалі на дзяленне тэрыторыі манастырскага комплексу на дзве функцыянальныя зоны. Першая, прызначаная пераважна для манахаў, з павольным рытмам жыцця, канцэнтрацыяй насельнікаў на малітве. Другая, прызначаная для наведвальнікаў і паломнікаў, з дастаткова актыўным і насычаным рытмам, які складаецца з набажэнстваў, экскурсій, сустрэч са святарамі.

Аналізуючы лад жыцця і спецыфіку служэння сучасных праваслаўных манастыроў Беларусі, можна вылучыць наступныя тыпы:

- **стаўрапігіяльны манастыр супольнага жыцця;**



- **манастыр супольнага жыцця;**
- **падворак;**
- **пустынь;**
- **стаўрапігіяльны скіт;**
- **скіт.**

Дадзеная тыпалогія адлюстроўвае тэндэнцыю памяншэння паломніцкага служэння і павелічэнне малітоўнага, выняткам з'яўляецца толькі падворак са сваім асаблівым ладам жыцця. Кожнаму тыпу уласціва свая дамінуючая скіраванасць і разнастайная кампаноўка функцый, што адлюстроўваецца ў месцазнаходжанні манастырскага комплекса, складзе будынкаў, вобразным рашэнні. Манастыры дзеляцца на дзве катэгорыі (мужчынскія і жаночыя), што аказвае пэўны ўплыў на спецыфіку іх дзейнасці. Напрыклад, для мужчынскіх характэрны напрамкі, якія патрабуюць фізічнай сілы (кавальства, разьба па дрэву, цяслярства і інш); для жаночых – цярплівасці, ўвагі (вышыванне, дагляд за хворымі, састарэлымі і інш.).

Вышэйшым па адміністрацыйным статусе з'яўляецца **стаўрапігіяльны манастыр супольнага жыцця**, які падпарадкоўваецца непасрэдна мітрапаліту. У Беларусі такімі з'яўляюцца: Жыровіцкі Свята-Успенскі мужчынскі манастыр і Гродзенскі Свята-Раства-Багародзіцкі жаночы манастыр з арыентыровачнай колькасцю насельнікаў 30 у кожным. Яго функцыянальнае насычэнне: богаслужбовае, супольнае манаскае жыццё, паломніцкае, афіцыйна-цырыманіяльнае, місіянерскае, асветніцкае, адукацыйнае, выхаваўчае, сацыяльнае, гаспадарчае. У комплекс уваходзяць: сабор, манастырскія храмы, капліцы, званіцы, кялейныя карпусы, трапезныя, гасцініцы для паломнікаў, гаспадарча-бытавыя пабудовы і інш. Тэрыторыя стаўрапігіяльнага манастыра з'яўляецца вялікай па плошчы са складанай функцыянальнай арганізацыяй.

**Манастыр супольнага жыцця** з'яўляецца найбольш распаўсюджаным тыпам. У параўнанні з стаўрапігіяльным назіраецца памяншэнне маштабаў манастыра, звужэнне спектра служэння з сыходам афіцыйна-цырыманіяльнай функцыі. Як правіла, ў склад комплексу ўваходзяць: манастырскі храм, званіца, кялейныя карпусы, трапезная, гасцініца для паломнікаў, гаспадарча-бытавыя пабудовы. Адносна колькаснага складу манастыроў можна назіраць вялікі дыяпазон: гэта і малыя манастыры с колькасцю




Мал.1 Схема генеральнага плана Свята-Елісавецінскага манастыра: 1.Свята-Елісавецінская царква, 2.Кялейны корпус, 3.Вартоўня, 4. Царква ў гонар абраза Божай Маці «Дзяржаўны», 5.Дом сястрыцтва к.1, 6.Дом сястрыцтва к.2, 7.Блінная, 8.Будынак аховы, 9.КПС, 10.Трансфарматарная падстанцыя, 11.Аўтастаянка, 12.Корпус паломнікаў, 13.Нядзельная школа, 14.Выставачны цэнтр, 15.Царкоўны шапік, 16.Гандлёвыя рады, 17. Крама царкоўнага начыння, 18.Надбрамная званіца.

насельнікаў менш за 10 (Аршанскі Свята-Богаяўленскі Куцеінскі манастыр), і дастакова вялікія (Мінскі Свята-Елісавецінскі жаночы манастыр (Мал.1)), з колькасцю сясцёр — 85, але, нягледзячы на рознамаштабнасць тэрыторый манастыроў, застаецца нязменным іх функцыянальнае насычэнне.

**Падворак**. У параўнанні з традыцыйным тлумачэннем манастырскага падворка як месца пражывання ў горадзе манахаў загараднага манастыра [4], сучасны беларускі досвед падае і іншае разуменне тэрміна, а менавіта: вынас за тэрыторыю горада пэўных богаслужбовых, вытворчых, гаспадарчых і сацыяльных функцый. Абумоўлена гэта, ў першую чаргу, тэрытарыяльным абмежаваннем развіцця манастыра



ў структуры горада. Як прыклад можна прывесці падворак Мінскага Свята-Елісавецінскага манастыра, які месціцца побач з в. Лысая Гара ў 30 км ад Мінску. Сюды часткова былі вынесены: вытворчая, гаспадарчая, сацыяльная функцыі, што ўвасобілася ў будаўніцтве храма, брацкага корпуса (для сацыяльна неўладкаваных людзей), жывёлагадоўчай фермы, лесапільні, вытворчасці свечак і інш. У сувязі са спецыфікай жыццядзейнасці падворка, у прыватнасці колькаснай перавażнасцю братоў (50-80 чал.), якія праходзяць рэабілітацыю, і толькі некалькіх манахінь, адсутнічае дзяленне тэрыторыі на дзве функцыянальныя зоны: для манахаў і паломнікаў. Пpасторавая структура комплекса вылучаецца разгалінаванасцю і дзяленнем на адасобленыя функцыянальныя зоны, якія свабодна размяркоўваюцца на вялікіх тэрыторыях падворка.

**Пустынь.** Першапачаткова з'яўлялася невялікім па колькасці і плошчы мужчынскім пасяленнем, якое мела не больш за адзін храм, прытрымлівалася строгага статуту, адасобленага жыцця. У Беларусі такім аб'ектам з'яўляецца Спаса-Праабражэнская пустынь в. Хмелева Брэсцкага р-на. З далейшым развіццём

функцыянальнае насычэнне і тэрыторыя пустыні часта набліжаецца да манастыра супольнага жыцця.

**Стаўрапігіяльны скіт** — адасобленае, самастойнае жыллё манахаў, якія падпарадкоўваюцца мітрапаліту. Манахі, якія жывуць у скіту, прымаюць дадатковыя зарокі (строгі пост, адмысловая малітва, самотніцтва). Прыкладам такога ўтварэння з'яўляецца Свята-Увядзенскі скіт в. Багушы Смаргонскага р-на, ў склад якога ўваходзіць Свята-Увядзенскі храм, званіца, кялейны корпус, трапезная, гаспадарчы блок і г.д. Пададзены склад пабудоў сведчыць аб разгалінаванай структуры стаўрапігіяльнага скіта і дастаткова вялікай яго тэрыторыі.

**Скіт** — самастойнае альбо структурна вылучанае ў манастыры адасобленае жыллё пустэльніка. Звычайна скіт зачынены для наведвальнікаў, такім чынам застаецца толькі жылая і богаслужбовая функцыі, якія месцяцца на невялікай адасобленай тэрыторыі. Як прыклад можна прывесці Свята-Панцеляймонаўскі жаночы скіт у Браславе, структурнае падраздзяленне Полацкага Свята-Ефрасіннеўскага манастыра, які знаходзіцца ў аднапавярховым будынку і займае невялікую тэрыторыю сярод жылой забудовы горада.

Паводле размяшчэння манастырскіх комплексаў на тэрыторыі Беларусі можна вылучыць наступныя варыянты:

**- у структуры гарадоў;**

**- у структуры сельскіх паселішчаў;**

**- на міжсялібных тэрыторыях.**

Значная **большасць сучасных манастыроў Беларусі ўваходзяць у структуру вялікіх і малых гарадоў**. З аднаго боку, такое размяшчэнне можна тлумачыць іх аднаўленнем на старадаўніх месцах, з другога — зручнасцю сацыяльнага служэння, найвялікшая неабходнасць у якім адчуваецца менавіта ў гарадах. Станоўчым фактарам такога рашэння выступае: блізкае размяшчэнне аб'ектаў сацыяльнага служэння, інтэграцыя ў гарадскую транспартную і інжынерную структуру. Адмоўнымі фактарамі такога размяшчэння з'яўляюцца: перадумовы страты ўласцівага манастыру ладу жыцця (супакаення, павольнасці, засяроджання на ўнутраным стане), блізкасць разнастайных спакусаў.

Адпаведна з размяшчэннем манастыроў у прасторавай структуры горада можна вылучыць наступныя рашэнні:

- *у цэнтральнай (гістарычнай) частцы горада.* Дадзены варыянт характэрны ў большай ступені для аднаўляемых на старых месцах манастыроў. Прыкладам можа служыць Гродзенскі Свята-Раства-Багародзіцкі жаночы манастыр, які актыўна ўдзельнічае ў стварэнні сілуэта старой часткі горада. Станоўчымі фактарамі такога месцазнаходжання з'яўляюцца: ўзбагачэнне архітэктурнай кампазіцыі горада выразным вобразам і аб'ёмна-прасторавым рашэннем комплекса; далучэнне да склаўшыхся сістэм транспарту і інжынернага забеспячэння. Адмоўнымі — немагчымасць далейшага развіцця манастыра, звязаная з вялікай шчыльнасцю забудовы ў цэнтральных частках гарадоў; шумнасць, выкліканая шматфункцыянальным насычэннем цэнтра і актыўнасцю ўстаноў, якія дысаніруюць са спакойным ладам манастырскага жыцця;

- *у перыферыйных частках горада.* Пры такім горадабудаўнічым рашэнні манастырскі комплекс мае большы, ў параўнанні з цэнтральнай часткай, патэнцыял развіцця і разгалінавання структуры. Ілюстрацыяй можа служыць Полацкі Свята-Ефрасіннеўскі жаночы манастыр, які атачае дастаткова разрэджаная забудова і зялёныя насаджэнні. Адмоўны бок такога горадабудаўнічага рашэння — меншы ўзровень рэпрэзентатыўнасці пляцовак, страта кампазіцыяй горада горадабудаўнічай дамінанты і аб'екта з высокімі архітэктурна-мастацкімі якасцямі;

- *на рэкрэацыйных тэрыторыях.* Прыкладам з'яўляецца Магілёўскі Свята-Мікольскі жаночы манастыр (Мал.2), які знаходзіцца ў зялёнай зоне, побач з ракой. Станоўчым фактарам такога рашэння выступае маляўнічае спалучэнне архітэктуры і ландшафта, адкрытых і закрытых прастораў, адлюстраванне ў водных паверхнях, сілуэтнасць, захаванне манастырскага адасобленага ладу жыцця. Адмоўным —



адасобленасць ад архітэктурнай кампазіцыі горада, неабходнасць стварэння сваёй сістэмы транспартных і інжынерных камунікацый.



Мал.2 Магілёўскі Свята-Мікольскі жаночы манастыр

Другімі па колькасці выступаюць **манастыры, якія размяшчаюцца ў структуры сельскіх паселішчаў.** Станоўчым фактарам такога рашэння з'яўляецца: дастаткова спакойны лад жыцця, павольны рытм дзейнасці, выкарыстоўванне сфарміраванай інфраструктуры, магчымасць дабрацца рэйсавым грамадскім транспартам; адмоўным — блізкасць мірскога жыцця.

Адпаведна з размяшчэннем ў прасторавай структуры сельскага паселішча можна вылучыць наступныя рашэнні:

- *у цэнтры сельскага паселішча.* Як прыклад можна прывесці Жыровіцкі Свята-Успенскі мужчынскі манастыр, які стварае адмысловы «твар» паселішча. Адмоўным з'яўляецца суседства з грамадскім цэнтрам, які мае актыўны рытм жыццядзейнасці і як вынік шумавы фон.

- *унутры забудовы сельскага паселішча.* Прыкладам можа выступіць Дамашанскі Свята-Іанна-Багаслоўскі жаночы манастыр Смалявіцкага р-на. Адмоўнай рысай такога размяшчэння выступае заціснутасць комплекса, немагчымасць свабоднага развіцця, камуфліраванне ўнутры жылой забудовы, непасрэднае межаванне з прыватнымі ўчасткамі.

- *на ускраіне сельскага паселішча.* Добрай ілюстрацыяй такога рашэння з'яўляецца Лядзенскі Свята-Дабравешчанскі мужчынскі манастыр, які выдатна ўспрымаецца не толькі з мясцовых дарог, але і з трасы Мінск-Магілёў. Станоўчымі фактарамі такога рашэння выступаюць бесперашкоднае развіццё манастырскага комплексу, дастатковая спакойнасць жыцця і мінімальнае ўзаемадзеянне з паселішчам, панарамнае раскрыццё кампазіцыі.

Найменшым па колькасці з'яўляецца варыянт **размяшчэння манастырскага комплексу на міжсялібных тэрыторыях.** Станоўчым фактарам такога рашэння з'яўляецца стварэнне найбольш спрыяльных умоў для глыбокага духоўнага ўдасканалення, ізаляванасць гаспадаркі, гарманічнае спалучэнне манастыр — прыродны ландшафт. Адмоўным — неабходнасць стварэння усёй транспартнай і інжынернай структуры ўласнымі сіламі, што патрабуе вялікіх фінансавых выдаткаў. Як прыклад можна прывесці Лаўрышэўскі Свята-Елісееўскі мужчынскі манастыр Навагрудскага раёну, які знаходзіцца ў маляўнічым месцы і аддзелены ад бліжэйшага паселішча ракой.

Паводле паходжання манастырскія тэрыторыі можна класіфікаваць як:

- ***аднаўленне дзейнасці манастыра на гістарычным месцы,*** у гэты тып уваходзяць манастыры з ацалелай цалкам ці часткова структурай комплекса і пабудовамі. На дадзеным этапе часта адбываецца працэс рэстаўрацыі альбо рэканструкцыі. Прыкладам можа служыць Пустынскі Свята-Успенскі мужчынскі манастыр Мсціслаўскага р-на (Мал.3), у выпадку якога мы маем справу з нязмененай структурай і часткова захаваўшыміся аб'ектамі комплекса. Станоўчым фактарам такога падыходу выступае цэласнасць ансамбля, аднаўленне помніка архітэктуры высокай каштоўнасці.

- ***стварэнне манастыра на летапісным месцы,*** да гэтага тыпу адносіцца Лаўрышэўскі Свята-Елісееўскі мужчынскі манастыр Навагрудскага раёну (Мал.4), аб якім захаваліся толькі ўзгадкі ў пісьмовых крыніцах без графічных выяў. На сённяшні дзень комплекс з'яўляецца дастаткова сціплым, хаця ў свой час быў адным з самых буйных у ВКЛ і меў статус лаўры. Як станоўчы фактар выступае старадаўняя гісторыя, якая можа служыць добрым стымулам для развіцця і аднаўлення мінулай прывабнасці манастыра і адраджэння традыцый нацыянальнай архітэктуры. Адмоўным — адсутнасць дастатковага аб'ёму графічнай інфармацыі, неабходнай для ўзнаўлення вобразу старадаўняга манастыра.




Мал.3 Пустынскі Свята-Успенскі мужчынскі манастыр


Мал.4 Лаўрышэўскі Свята-Елісееўскі мужчынскі манастыр (праект)

- ***стварэнне манастыра на месцы яго сацыяльнага служэння.*** Прыкладам названага тыпу з'яўляецца Мінскі Свята-Елісавецінскі жаночы манастыр, заснаваны побач з псіханеўралагічнай бальніцай, у якой сёстры апякуюць хворымі. Станоўчым бокам такога размяшчэння з'яўляецца непасрэдная сувязь з аб'ектамі сацыяльнага служэння, адмоўным — абмежаванасць развіцця комплекса.

- ***стварэнне манастыра на месцы рэлігійных падзей (цудадзейнае з'яўленне абраза, служэнне мясцовага святога і інш.)***. У г.п.. Карма ў 2000 годзе быў заснаваны Свята-Іанна-Кармянскі жаночы манастыр на месцы служэння новапраслаўленага беларускага святога протапрасвітэра Іанна Гашкевіча. Станоўчым пры такім размяшчэнні з'яўляецца

яднанне крыніцы духоўнай падтрымкі і месца паломніцтва. Адмоўным, у нашым выпадку — размяшчэнне на цэнтральнай плошчы пасёлка і, адпаведна, пэўная шумнасць асяроддзя.

- ***стварэнне манастыра на новым месцы.*** Праілюстраваць такое рашэнне можна Свята-Уведзенскім стаўрапігіяльным скітом в. Багушы Смаргонскага р-на, які быў пабудаваны побач з вёскай на пустой нізіне недалёка ад леса. Станоўчым з'яўляецца магчымасць самастойнага выбару найбольш прыдатнага участка, адмоўным — адсутнасць адмысловай «легенды» мясцовасці, якая б павялічвала цікавасць да манастыра як часткі культурнай спадчыны.

- ***прыстасаванне пад манастыр тэрыторый іншага прызначэння.*** Прыкладам такога рашэння з'яўляецца Гомельскі Свята-Ціхвінскі жаночы манастыр (Мал.5), пад які была прыстасавана школа. Станоўчы фактар названага рашэння — наяўнасць пабудовы, сфарміраванай транспартнай і інжынернай



структуры. Адмоўны — немагчымасць пашырэння тэрыторыі, месца ў структуры паселішча, першапачаткова прызначанае пад іншую функцыю, не адпавядае спецыфіцы манастырскага комплексу.


Мал.5 Гомельскі Свята-Ціхвінскі жаночы манастыр

**Высновы**

На падставе праведзенага даследавання прапанавана тыпалогія сучасных праваслаўных манастырскіх комплексаў Беларусі з вылучэннем характэрных рыс. Для стварэння найбольш спрыяльных умоў дзейнасці манастыроў і раскрыцця іх горадабудаўнічага патэнцыялу рэкамендуецца:

- размяшчаць манастырскія комплексы ў структуры гарадоў на рэкрэацыйных тэрыторыях, з візуальным раскрыццём адносна транспартных і пешаходных восяў агульнагарадскога значэння;

- размяшчаць манастырскія комплексы ў структуры сельскіх паселішчаў на ўскраіне, з візуальным раскрыццём на дарогі рэспубліканскага і абласнога значэння;

- захоўваць структуры старадаўніх манастыроў, падпарадкоўваць новыя аб'екты горадабудаўнічым і вобразным рашэнням ансамбля;

- накіраваць намаганні даследчыкаў на пошук архіўных, літаратурных і натурных даследаванняў, якія дапамагалі б раскрыццю нацыянальнай архітэктурнай спадчыны праваслаўных манастыроў;

- пры прыстасаванні пад манастырскі комплекс тэрыторый іншага прызначэння максімальна ўлічваць тыпалогію і спецыфіку служэння будучага манастыра.

**Літаратура**

1. Лазука, Б.А. Слоўнік тэрмінаў: Архітэктура, выяўленчае мастацтва і дэкаратыўна-прыкладное мастацтва: Дапам. для вучняў / Б.А. Лазука. — Мінск: Беларусь, 2001. — 158 с.
2. Новогрудской епархии — 690 / Свято-Успенский Жировичский мужской монастырь;

ред. Т.И.Маркач. — Жировичи, 2007. — 240 с.
3. Рэлігія і царква на Беларусі: Энцыкл. давед. / Г.П.Пашкоў [і інш.]; пад рэд. Г.П.Пашкова. — Мінск: БелЭн, 2001. — 368 с.
4. Подворье // Википедия [Электронный ресурс]. — 2001-2009. — Режим доступа: http://ru.wikipedia.org/wiki/%D0%92%D0%B8%D0%BA%D0%B8%D0%BF%D0%B5%D0%B4%D0%B8%D1%8F. — Дата доступа: 2.12.2009.
5. Самохин, М. Древние иноческие уставы и современный опыт монастырской жизни / М. Самохин // Православие.Ru [Электронный ресурс]. — 1999-2009. — Режим доступа: http://www.pravoslavie.ru/sm/31557.htm. — Дата доступа: 25.11.2009.
6. Слюнькова, И.Н. Монастыри восточной и западной традиций. Наследие архитектуры Беларуси / И.Н. Слюнькова. — Москва: Прогресс-Традиция, 2002 — 600 с.
7. Вараб'ёў, В.Г. Вопыт будаўніцтва праваслаўных комплексаў (на прыкладзе Свята-Елісавецінскага манастыра ў г.Мінску). / В.Г. Вараб'ёў // Архитектура и строительные науки. — 2009. — № 1 (9). — С. 17-19.

---

*Арабей, В.Г. Роля сучаснага праваслаўнага манастырскага комплекса ў структуры паселішчаў і міжсялібных тэрыторый Беларусі (1990-2009 гг.) / В.Г. Арабей // Вес. Полоцкого ун-та. Сер. F. Строительство. Прикладные науки. – 2009. – № 12. – С. 33–38.*